КОШТ 2 РУБ.

*Пралетарыі усіх краеў, злучайцеся!*

# Савецкая Беларусь

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Менск, Літэрацка-выдавецкі аддзел Палітычнага ўпраўленьня Заходняга хронту.

ВЫДАННЬ РЭУКОМУ САЦЫЯЛІСТКАЙ САВЕЦКАЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСІ.

№ 21 (31). Серада, 8-га верасьня 1920 г

## Новая Савецкая Рэспубліка.

У сям'ю савецкіх сацыялістскіх Рэспублік увайшоў новы сябар—Аўтаномная Кіргізкая Сацыялістская Савецкая Рэспубліка.

Кіргізкі працоўны народ увесь час да рэвалюцыі знаходзіўся на палажэньні пасынка Расеі. Царскае правіцельства толькі і ўспамінала аб ім, калі яму трэ' было сабіраць з яго якіе-колечы падаткі, ці высасваць з яго сокі праз аднацьце жывёлы і іншай маемасьці.

Ні школ, ні бальніц, ніякіх адзнакаў ля культурнага будаўніцтва ля кіргізкага народу не давалася. Ён жыў бязпраўным, цёмным, сам сабою, па волі лёсу, як і многіе-многіе народнасьці, меўшые здарэньне быць пад вартоўнай аховаю царскага чыноўніка. І як усе другіе народы, кіргізаў давілі бязьлітасна хваробы, мучыў голад, і праводзілі ўсе іншые бядоты, злучаные цесна з жыцьцём занядбанага „паўдзікага“ народу. І кіргізы выміралі надта хутка, а гэта нікога не клапаціла ў царскай Расеі ні чуткі.

І хто ведае, якая-б доля сустрэла кіргізкі працоўны народ далей, каб папанаваў над Расеяй цар.

Але на шчасьце ўсіх прыгнячёных і абяздоленых, як клясавых так і нацыянальных нявольнікаў, прышла Вялікая Акцябрская Рэвалюцыя і аслабаніла працоўные народы ад усякага ўсьціску.

Усякі прыгон, усякае бяспраўе згінулі навекі.

Кожны з асобных народаў Расеі стаў вольным і раўнапраўным сябром Расейскай Фэдэрацкай Рэспублікі, кожны дастаў правы на адзначэньне.

Работніцка - Сялянскае правіцельства Расеі не пярэчыла і не пярэчыць кожнаму народу жыць па свойму, будаваць сваю долю асобна—абы на тое выказана было пажаданьне яго працоўнікаў. **Ніякіх гвалтау і насаджэньня сілаю сваіх парадкау ні воднаму народу яно не рабіла і ня робіць,** як аб тым брахліва гукаюць усе ворагі Савецкай Расеі і Вялікай Рэвалюцыі.

Прыклад з цэлым радам новых дэкрэтаваных за апошні толькі час Савецкіх аўтаномных рэспублік таму прыклад. Татарская, Башкірская, а цяпер Кіргізкая (дэкрэт ад 1 верасьня) аўтаномные рэспублікі ўзбагацілі шырокую Савецкую Фэдэрацыю Расеі. Німа сумленьня, што сьледам за гэтымі новымі рэспублікамі будуць абвешчаны і дэкрэдытованы і тые, якіе стаяць ужо на чарзе (Беларусь), каб адным моцным саюзам закрапіць вялікіе заваяваньні працоўнічай Рэвалюцыі.

А пакуль што пажадаем шчаснага жыцьця навароджанай Кіргізкай Сацыялістнай Савецкай Рэспублікі.

З. Жылуновіч.

## Абарона Савецкіх Рэспублік.

*(Весткі з хронту, адтрыманные ад Палявога Штабу Рэвалюцыйнага Ваеннага Савету Рэспублікі за 6-е верасьня).*

### Заходні хронт.

**Паўдзёна ўсходней ад Беластоку адбываюцца бітвы з пераменнымі ўдачамі.**

**Захадней Грубяшова нашые часьці зьбілі праціўніка, захапіўшы 200 палонных.**

### Паудзенна-Заходні хронт.

**У ваколіцы Рагаціна нашые войскі прарваўшы варожы хронт забралі ў бітве мястэчка Паткамень і захапілі палонных і чатыры гарматы.**

### Паудзенны хронт.

**На Крымскім вучастку ў Пераяслаўскім райёне нашые войскі зноў адбілі варожы наступ з вялікімі для варага стратамі, прычым нашым агнём падбіты тры варожые танкі, з каторых два захоплены намі.**

*Ваенкам Палявога Штабу* **Данішэўскі.**

## Вакол вайны і міру.

### Мірные перагаворы.

**Як паведамляюць рыжскіе газэты, 6 верасьня мела прыбыць у Рыгу польская мірная дэлегацыя**

---

### За Савецкую Расею.

Французкая газ. „Юманітэ“ паведамляе, што апошняя заява Амэрыкі італьянскаму правіцельству аб расейскіх справах не выяўляе пагляду дзяржаўнага сэкратара Кольбі і яго таварышоў, якіе **лічаць неабходным безаткладна пачаць зносіны з Расеяй.** Прэзыдэнт, які паслаў гэту заяву уступіў у нязгоду з міністрамі. Кольбі паведаміў Польшчу, **што большасьць амэрыканцаў не спачуваюць таму, што Амэрыка падтрымлівае Польшчу проціў Расеі.**

---

### Інтэрнацыянальны кангрэс маракоў і вайна.

*На пасяджэньні 13 жніўня Інтэрнацыянальнага кангрэсу маракоў у Брусэлі была прынята рэзалюцыя такога зьместу, што для таго, каб не дапусьціць будучых войнаў, маракі атказуцца перавазіць войскі і амуніцыю. Гэта мера павінна ў хуткім часе прымяніцца к руска польскай вайне. Маракі катэгарычна заяўляюць аб сваім атказе перавозіць вайсковую маемасьць, прадназначаную проціў Савецкай Расеі.*

---

### „Ужо позна“.

Правіцельства Паўночных Злучаных Штатаў Амэрыкі адтрымала 300 прозьбаў ад імя ўсіх адбыўшыхся у Польшы сходаў даць помач Польшы. У Вашынгтоне (стал. Амэрыкі) думаюць, што ўжо позна даць Польшчы матар'яльную помач і лепшым дзелам было б ёй хутчэй пайсьці на заміраньне з Савецкаю Расеяй.

---

### Як сустракаюць Чырвоную армію ў Галіччыне.

Галіцыйскіе сяляне сустракаюць чырвонаармейцаў вельмі сардэчна і просяць зараз жа мобілізаваць іх ва барацьбу з панамі. Адразу пачынаюць арганізаваць Савецкую Ўладу і партыйные Органы. Вельмі цікавяцца нашай літэратурай.

# Адозва Француэкай сацыялісткай партыі.

„Ужо больш трох гадоў капіталістскіе правіцельствы Антанты гадуюць свае зла дзейскіе намеры, каб зьнішто-жыць савецкі парадак і наладзіць у Расеі такі палітычны і сацыяльны лад, які здаволіў бы іх. Савецкае правіцельства пры падтрыманьні ўсюды рабочых нанясло Антанце цэлы рад паражэньняў: паражэньне ў Архангельску і Адэсе, паражэньне Юдэніча, Калчака і Дэнікіна, паражэньне белай Фіньляндыі, а цяпер паражэньне захватніцкай, фэодальнай і клерыкальнай Польшчы, апошняга найміта англо-француэкага капіталу.

**Мы будзем вітаць пабедную рэвалюцыю на Віоьле,—рэвалюцыю, якая бязупынна пасоўваецца з Усходу на Захад.**

Каб у гэты вялікі момант затрымаць Чырвоную армію, якая нясе з сабою мір працоўнаму люду, Антанта пробавала мобілізаваць суме́жные з Расеяй дзяржавы, але ўсюды адтрымала адмову, бо правіцельствы апошніх самі дрыжаць перад сацыялістскай небясьпекай. Дзяржавы Антанты падгатовілі мобілізацыю сваіх уласных армій, будавалі новые пляны, якіе пагражалі давесьці да новай усясьветнай вайны.

**У сучасны момант на карту пастаўлена будучнасьць пралетарыяту, яго аслабаненьне, пабеда сацыялізму ў Зўропе і ўсюды.**

Абарона расейскай рэвалюцыі ёсьць пачатак усясьветнай рэвалюцыі. **Калі мы не падтрымаем яе ўсімі сіламі, якіе толькі ёсьць у нашым распараджэньні, то гэта будзе значыць, што мы здрадзілі не толькі ёй, Расейскай Рэвалюцыі, але здрадзілі Ўсясьветнай Рэвалюцыі.**

Энэргічная пастанова, прынятая ангельскай рабочай партыяй,—усе сілы і способы, каб перашкодзіць праступнай вайне,—прымусіць правіцельства да поўнай уступкі.

Антанта афіцыяльна адмовілася ад пасылкі войск, але зусім не адмовілася ад скрытнага падтрыманьня польскага імпэрыялізму і Урангэля. Яна скрытна пасылае войскі і амуніцыю, яна адпавіла блёкаду.

Няўжо вы дазволіце прадаўжаць вайну проціў Расейскай Рэвалюцыі? Мы пытаем: **Ніводнага чалавека, ніводнага граша, ніводнай кулі.**

Расейская Рэвалюцыя аддала сябе на службу пралетарыяту ўсяго сьвету. За вас яна змагаецца з нязьлічанымі ахвярамі пры аграмадных цяжарах. Яна вам нясе львіную долю вашага аслабаненьня. Так змагайцеся і вы за яе на вашай зямлі.

Мір з Савецкай Расеяй, прызнаньне таго ладу, які яна сама сабе дала—вось за што мы павінны цяпер змагацца".

# Рух рэвалюцыі на усім сьвеце.

## Рэвалюцыйны рух у Італіі расьце.

*Рух італьянскіх рабочых мэталістаў разростаецца і прымае ўсё больш сур'ёзны характар. Рабочымі заняты 5 хвабрык у Рыме, 16 у Турыне. У Нэапалі, Бэргаме і другіх важных пунктах, асабліва ў Ламбардыі, рабочые пастанавілі рабіць розные перашкоды ў рабоце.*

## Перад рэвалюцыйным выбухам.

Ва ўсей Італіі пачаўся сільны рэвалюцыйны рух. У Гэнуі аб'яўлена агульная забастоўка. У Нэапалі рабочые мэталісты захапілі заводы, каторые яны занялі сваімі атрадамі. У Булоні, Тэрні і Ліворно рабочые забралі ў свае рукі розные заводы і правіцельственны склад аружжа. У Вэнэцыі Міланская работніцкая партыя кажа, што рабочые выявілі добрую дысцыплінарнасьць, і работа ва ўсіх заводах адбываецца нармальна.

Словам, уся Італія знаходзіцца на пярэдадні бальшавіцкай рэвалюцыі.

## Савецкая упада у Партугаліі.

У Партугаліі ў вакрузе Алемдзезо рабочымі аб'яўлен Савецкі парадак. Правіцельства туды паслала войскі.

## Рабочые пераходзяць ад слоў к дзелу.

З Вашынгтону (сталіца Злучаных Штатаў Паўночнай Амэрыкі) паведамляюць, што Чыкагскі саюз працы і Сіетльскі цэнтральны саюз рабочых аднагалосна прынялі рэзалюцыю з патрабаваньнем, каб правіцельства не давала ніякай падмогі Польшчы проціў Расеі. Чыкагскіе рабочые прырэклі аб'явіць агульную забастоўку, а ў Сіеттле арганізаваўся камітэт чыннасьці, прычым рабочые прасілі Гомпэрса склікаць выканаўчы камітэт амэрыканскага саюзу працы.

## Да III Інтэрнацыяналу.

Савет рэвалюцыйных рабочых сацыял-дэмакратаў у Вэне (Аўстрыя) аб'явіў, што яго сябры лічаць сябе прыхільнікамі III Інтэрнацыяналу і будуць падаваць галасы за камуністаў.

## Кангрэс прафэсыянальных саюзаў.

Паведамляюць, што 22 жніўня ў Бамбеі (Індыя) адчыніўся кангрэс прафэсыянальных рабочых Індыстану.

## У Карэі.

Усе сэкрэтные распараджэньні часовага правіцельства, прызнанага ўсімі карэйцамі, выпаўняюцца акуратна.

# „Родные з'явы".

### „Маленькі фэльетон".

*Вучыцель Ясь,*
*Працуючы ў Бабруйску,*
*Хоць сам і беларус,*
*Шчытае за прымус*
*Вучыць дзяцей па беларуску.*

---

*Знатоўшы прымку адзін раз*
*У Менск паехаць, у нарабраз,*
*Гукаў ад злосьці ён мо з час:*
*„Ня трэба ў нас*
*Ні знаньня*
*Навучаньня*
*Па мужычы!*
*(Па беларуску)—*
*Што за звычай?*
*Нашлі дзела —*
*Шчэ й аддзелы*
*Беларускіе заводзіць"!*
*Сам крычыць, вакола ходзіць,*
*З злосьці тупае нагамі:*
*„Што за ліха гэта з вамі?"*
*Ледзьве сьцешылі ваяку.*
*А за тым ўсё болей, далей*
*Ўгаманілі небараку*
*З пяць інструкцыяў адвесьці*
*Ля кірунку там, на месьце.*
*Хлопец ўзяў, улажыў ў карманы,*
*А... дарогаю... й зьніштожыў*
*І на мейсцы – ані пісну.*
*Быццам гладка ўсё ішлося.*

---

*На здарэньне гэта ў Дзісьне*
*Гучна рэха аддалося:*
*Там прыяцелі-Ясюткі*
*К гэтым „справам" дужа чуткі:*
*„Гэта добра Яська робіць,*
*Што паганай справе шкодзіць!"*
*Ў пахвалу пашлі гукаці*
*І ў сябе каб не адстаці*
*К беларусам напаролісь*
*Ня даць граць ў тэатру „Калісь"*
*(Драму з часоў Рэвалюцыі 1905*
*[году),*
*А ў замену*
*Пару хвареаў завучылі,*
*І весь вечар люд вучылі*
*Як тут хлешчай*
*„Парашок здабыць ад цешчы"*
*Й „Маладога ў чахле бачыць" —*
*Трэба-ж троха падурачыць.*
*Хто ў театр ісьці ахвочы,*
*Хай даволі парагоча,*
*Ўмест палітыкі спрыкраўшай.*

---

*Два прыклады адабраўшы*
*Мы ад доўгага іх цугу,*
*Поўны дзіва,*
*Як вучыцялі услугу*
*Робяць цёмнаму народу —*
*„Пашыраюць свабоду,*
*Пашыраючы навуку"...*
*Чарнасотнікам ў угоду,*
*Контр-рэвалюцыі на руку.*

**Авадзен.**

